# Надзежда Грыгор'еўна ГРЭК

## Кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР ад Веткаўскай сельскай выбарчай акругі

Анастасія Ігнацьеўна прыбірала ў кватэры пасля знедання, калі малады, вясёлы пісьманосец падаў ёй пачку свежых газет, пахнуўшых фарбай.

Разгарнуўшы «Звязду», яна радасна ўскрыкнула: «Надзенька, дачка мая!»

Са старонкі газеты глядзеў на яе родны, знаёмы да малейшай рыскі твар яе дачкі. Пад партрэтам быў подпіс:

«Таварыш Грэк Надзежда Грыгор'еўна — кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР».

***

Гэта было ў мінулым годзе. Вечарам ва ўтульнай вялікай кватэры Анастасіі Ігнацьеўны сабралася ўся сям'я.

Шырокі стол ломіцца пад смачнымі блюдамі.

Маці любоўна агледжвае сыноў і дачок. Яна бачыць на якую шырокую, прыгожую дарогу выйшлі яе дзеці, які светлы шлях адкрыт перад кожным чалавекам у совецкай краіне.

Загадванне ўсімі застольнымі справамі ўзяў на сябе старэйшы сын Анастасіі — старшы лейтэнант Канстанцін Грыгор'евіч. Надзежда — любімая дачка ў маткі—налівае бакалы і лепш за ўсіх гаворыць тосты.

Першы тост падымаецца за слаўную Чырвоную Армію, за старшага лейтэнанта Канстанціна Грыгор'евіча. Бакалы падымаюцца за роскві́т авіяцыі, за былога падпаска Расціслава, сына стрэлачніка, цяперашняга курсанта авіяшколы, за здароўе кіно-тэхніка Васілія, за совецкае студэнцтва і будучых урачоў — Елену і Тамару, за здабытае шчасце і радасць вясёлых, чырвонашчокіх унукаў і ўнучак бабушкі Анастасіі.

— Бацька наш, — расказвае Анастасія, — многа гараваў стрэлачнікам, а хлеба заўсёды нехапала. Ён нажыў сабе туберкулёз і памёр, не дачакаўшыся ўбачыць радасці сваіх дзяцей.

Мяне вельмі папракалі вялікай сям'ёй — гаварылі з пагардай: «карміць няма чым, а кожны год раджае. Нарадзіла дзяцей адно другога менш». Цяпер гляджу на вас, сэрца радуецца і перад людзьмі не сорамна.

Ганарыцца Ігнацьеўна сапраўды ёсць чым. Усе яе шасцёра дзяцей вышлі на шырокую дарогу жыцця.

Увесь вечар гэтага незвычайнага злёту сям'і Грэк быў мімаволі ператвораны ў вечар успамінаў аб мінулым. Успаміналі жабрацтва ў дзяцінстве, як спалі ўсёй сям'ёй на падлозе або на печы, падсцілаючы пад сабой лахманы, якія апраналі днём. Расказвалі, як кожны ў дзяцінстве выконваў ролю пастушка і падпаска. Гаварылі аб чым марылі ў мінулым. Успаміналі дзяцінства Надзі.

Ёй ішоў тады дзесяты год. Аднаму кулаку, прывозіўшаму на продаж прадукты ў горад, яна была аддана на лета ў прыслугі за два пуды мукі і асміну бульбы. Няправільна назваўшы свой адрас, кулак адвёз дзяўчынку кудысьці на далёкі хутар.

Надзя працавала з раніцы да позняй ночы, пасвіла свіней.

Раніцой у траве блішчэлі буйныя кроплі расы. Свінні пасвіліся ў нізкіх зараслях кустоў, на паляне. За імі ішла Надзя бледная, хістаючыся ад бяссоння і стомленасці. Яе душылі злосць і слёзы. Яна не далічыла адной свінні. Доўга хадзіла яна па балоту. Хмызняк драпаў твар і босыя ногі.

— Скажы, дзе свіння?—асіплым голасам, выпучыўшы злыя вочы, крычаў гаспадар. — заб'ю! Ад моцнага ўдару



ў вачах дзяўчынкі пайшлі чырвоныя кругі...

М. ЧАУСКІ.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы